# Таленавіты мастак, выдатны педагог



Як і ўсякі таленавіты мастак, Ніна Рагоўская – чалавек сціплы. Пра сябе шмат распавядаць не любіць. Ды і навошта. Яе творчасць характарызуе яе нашмат красамоўней любых гучных слоў. Вырабы з керамікі з фірмовым вензелем «Н.Р.» за гады выстаў народных майстроў на фэстах і конкурсах усіх узроўняў ужо даўно разыйшліся далёка за межы Рэспублікі Беларусь. А ўнікальная тэхніка размалёўкі ангобнай белай глінай і зусім прызнана ўнікальнай. Удзельнік саюза народных майстроў Беларусі, Ніна Сямёнаўна надае вялікую ўвагу эстэтычнаму выхаванню моладзі. Яе ўнёсак у гэтым кірунку як выкладчыка мастацкага аддзялення Хоцімскай дзіцячай школы мастацтваў высока ацэнены кіраўніцтвам культуры Магілёўскага аблвыканкама. Яе вучні неаднаразова станавіліся прызёрамі і пераможцамі рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў.

Нестандартнае бачанне штодзённых прадметаў і з'яў, уменне разглядзець талент, знайсці індывідуальны падыход да кожнага дзіцяці адрознівае Ніну Сямёнаўну. Таленавітых дзяцей яна шукае не толькі ў гарадскім мястэчку, але і ў сельскай мясцовасці. І, вядома ж, не ўсе яны стануць мастакамі, але пачуццё выдатнага, развітае адным з лепшых педагогаў вобласці, несумненна адыграе сваю ролю ў жыцці. А гэта і ёсць галоўная мэта працы Ніны Рагоўскай.

**Алесь ЛЕСІН.**

**Лесін, А.** Таленавіты мастак, выдатны педагог : аб Рагоўскай Н.С. / Алесь Лесін // Шлях Кастрычніка. — 2012. — 25 лютага. — С. 2.